Источник: "Звязда" - 2013-01-18

Даты | Падзеі | Людзі

**1401** год — у Вільні падпісана Віленска-Радамская унія, дзяржаўны саюз Вялікага Княства Літоўскага і Польшчы. Акты, якія афармілі новую ўнію, выдадзены польскім каралём Ягайлам у 1400-м і Вітаўтам 18 студзеня 1401-га ў Вільні. Вітаўт атрымаў ад Ягайлы ВКЛ у пажыццёвае кіраванне разам з рускімі ўдзельнымі княствамі з правам свабоднага правядзення ўнутранай палітыкі. Ягайла захаваў тытул вярхоўнага князя літоўскага, а Вітаўт афіцыйна атрымаў тытул вялікага князя літоўскага. У гэты дзень у Вільні епіскапы, князі і баяры ВКЛ выдалі акт, у якім абавязаліся не парушаць дагавор паміж Ягайлам і Вітаўтам. Польскія паны аналагічны акт выдалі 11 сакавіка таго ж года ў Радаме. Упершыню ўнія паміж ВКЛ і Польшчай набыла характар дагавора паміж двума народамі.

**1216** год — завяршылася княжанне ў Полацку Уладзіміра, князя полацкага. У «Хроніцы Лівоніі» Генрыха Латвійскага ён называецца каралём Полацка. Вёў барацьбу супраць нямецкіх рыцараў, у пачатку XIII стагоддзя атрымліваў даніну ад ліваў і латгалаў, у саюзе з імі здзяйсняў паходы на захопленыя нямецкім ордэнам гарады Гольм, Іксколь. Падрыхтаваў сумесны паход палачан і літоўцаў на Рыгу, але ў дзень выступлення нечакана памёр.

**1882** год — нарадзіўся Іосіф Рыгоравіч Лангбард, беларускі архітэктар, заслужаны дзеяч мастацтваў і архітэктуры Беларусі (1934), доктар архітэктуры, прафесар (1939). Адзін з заснавальнікаў савецкай архітэктуры Беларусі. Сярод работ у Мінску: Дом урада, Цэнтральны Дом афіцэраў, будынак Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Беларусі, галоўны корпус НАН Беларусі. Адзін з аўтараў «Эскіза планіроўкі Мінска» і схемы генплана пасляваеннага Гомеля. Памёр у 1951 годзе.



Было сказана

**Андрэй ВОЛЯН (1530-1610), палітычны дзеяч, філосаф, правазнавец, ідэолаг Рэфармацыі на Беларусі:**

***«Справядлівасць патрабуе сумленна жыць, нікому не чыніць шкоды, кожнаму аддаваць тое, што яму належыць па праве, за добрыя справы ўзнагароджваць, а за дрэнныя — караць».***